Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 25 Вільня, Панядзелак 10 жніўня 1931 г. Год VII (XV)

Беларуская Крыніца

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Капіталізм, камунізм і хрысьціянскі сьветагляд.

(Да ідэолёгіі В.Х.Д.)

Трэба ўзгадовываць работнікаў у сьведамасьці сваей людзкой годнасьці, змусіць эканамічны і палітычны лібэралізм да новай грамадзкай палітыкі, збудаванай на падставах грамадзкай справядлівасьці, змагацца аднолькава проціў згубнага эгоістычнага індывідуалізму, як і проціў колектывізму. — З энцыклікі Лявона XIII „Rerum Novarum“.

Эканоміцы гаспадарчага хаосу, які паўстаў ад награмаджэньня надмернага багацьця ў руках адзінак трэба проціўставіць эканоміку, збудаваную на здаровых падставах хрысьціянскай грамадзкай філёзофіі. — З энцыклікі Пія XI „Quadragesimo Anno“.

Побач індывідуальнага эгоістычнага капіталізму пануе і такое-ж абшарніцтва, а з гэтае прычыны жменя людзей сталася панамі палажэньня вялікае масы працоўных.

Прагавіты капіталізм, прысвоіўшы сабе разьвіцьцё тэхнікі і новыя спосабы працы, ськіраваў іх проціў працоўных масаў і замест палёгкі ў здабыцьці дабрабыту, сучасная тэхніка сталася цяжарам і прычынай галоднага жыцьця працоўных.

Супроць капіталістычнай прагавітасьці паўстала ваяўнічая тэорыя соцыялізму, родным бацькам каторай зьяўляецца Карл Маркс і якая праявілася ў поўнай сваей форме на практыцы ў С.С.Р.Р. у апошнім слове соцыялізму —камунізьме.

Між гэтымі двума кірункамі бяздушнага матэр'ялізму рожніца невялікая. Яны аднолькава ствараюць формы грамадзкага жыцьця, падпарадкоўваючы працоўны народ пад пlivанаваньне над чалавекам матэрыі. Капіталізм змушае працоўныя масы аддавацца ў няволю багацьцю эгоістычнага індывідуалізму, а камунізм заганяе ў палон багацьця агульнага, калектыўнага.

Камунізм не вырашае так-жа і справы зямельнай, як не разьвязвае ён і абшарніцтва. У камунізьме на мейсца індывідуальнага абшарніцтва паўстае абшарніцтва колектыўнае ці дзяржаўнае. Абшарніцкая форма „земле-ўпарадкаваньня“ пазбаўляе сялянскія масы адпаведнага рольнага варштату працы, выкідаючы такім чынам сялянства за рамы капіталістычна-абшарніцкай эканомікі, а камунізм сваей колектыўнай формай зусім касуе сямейныя сялянскія гаспадаркі і, робячы агульніцу, стварае для сялянства новую па форме паншчыну.

Вось гэныя два варожыя між сабою і абодва аднолькава шкодныя чалавецтву кірункі стварылі варункі жыцьцёвыя зусім ужо немагчымыя. Сучасная гаспадарчая эканоміка апынулася ў тупіку. Паўстаў сапраўдны эканамічны хаос. Хлеба ўдоваль, ад тавараў трашчаць склады, усё таннае і адначасна працоўным масам недаступнае, бо няма працы і ў выніку — людзі галодныя, абдзёртыя і босыя.

Каб ратавацца ад гэтага нявольніцтва матэрыі мы чуем аўторытатыўныя словы хрысьціянскага сьветагляду.

„Трэба ўзгадовываць працоўны народ у сьведамасьці сваей людзкай годнасьці, эканоміцы гаспадарчага хаосу проціўставіць эканоміку, збудаваную на падставах грамадзкай справядлівасьці“...

Гэтак сказалі з высокага пасаду Апостальскай Сталіцы сорак гадоў таму Лявон XIII і некалькі месяцаў назад — Пій XI. На гэтай плятформе стаіць і „Беларуская Хрысьціянская Дэмократыя“.

Б.Х.Д. ідучы да палітычнай мэты Беларускага народу — да Яго самастойнасьці, ідзе шляхам усьведамленьня працоўнага народу ў яго людзкай годнасьці — шляхам усьведамляньня і ўзгадаваньня беларускага сялянства і работнікаў на грунце хрысьціянска-дэмакратычных ідэалаў і беларускай народнай культуры. Гэты шлях Б.Х.Д. выразна акрэсьліла ў сваей праграме і статуце §§ 1 і 4.

У справах соцыяльных Б.Х.Д. змагаецца з абшарніцтвам і капіталізмам, бо ўважае, што багацьце зграмаджанае ў вялікай меры ў адныя рукі ёсьць крыўдай для працоўнага народу, а ўважаючы, што прыватная ўласнасьць, абапёртая на працоўнай норме, дае ня толькі правы, але і накладае грамадзкія абавязкі, памагае выпрацоўваньню ў людзях ініцыятывы, самавітасьці і грамадзкай свабоды — дамагаецца для беззямельнага і малазямельнага сялянства рольнага варштату працы, абапёртага на працоўнай норме, на ўласнасьць і бяз выкупу (§§ 33, 34, 37, і 38).

Дык змагаймася з згубным матэр'ялізмам, як з капіталізмам і абшарніцтвам, так і з камунізмам, супроцьстаўляючы ім свае ідэалы народна-беларускія і соцыяльныя, акрэсьленыя праграмай і статутам Беларускай Хрысьціянскай Дэмократыі.

Ś. † P.

KS. MICHAŁ PIATROŬSKI

biełaruski dziejač, probašč u Winnaj |Bielskaha pawieta, pamior 25 lipnia s. h. majučy 42 hady. Pachawany na mahilniku ŭ Winnaj.

WIEČNAJA JAMU PAMIAĆ!

Бязвыхаднае палажэньне.

Паводле Вэрсальскага трактату (28.VI. 1919) была наложана на Нямеччыну вялізарная сума, каля 140 мільярдаў (мільярдаў, не мільёнаў) нямецкіх марак ваеннага адшкадаваньня, якое належалася дзяржавам — пераможніцам, на чале з Францыяй. Гэтую суму Немцы павінны былі плаціць у золаце, або ў заграпічных валютах. А найгорш тое, што ня было азначана праз колькі гадоў гэтая сума мае быць выплачана: выглядала так, што Немцам трэба было плаціць без канца. Дзеля таго Нямеччына заўсёды дамагалася перагляду справы ваенных адшкадаваньняў, паказваючы на свой нябывала цяжкі гаспадарчы стан. Аднак Францыя у сваіх адносінах да Нямеччыны была цьвёрдай — і калі Нямеччына не змагла ў 1923 годзе заплаціць усей вымаганай сумы, Францыя заняла войскам найболей прамысловую нямецкую краіну над ракою Рур і пачала сілай дабываць „належнае“ сабе адшкадаваньне. Але і Немцы ня ўступалі: у занятых францускім войскам правінцыях аб'явілі агульную забастоўку і абвясьцілі так зв. пасыўнае супраціўленьне, паводле якога ня выконвалі ніякіх загадаў францускага войска.

Тут Францыя праканалася, што сілаю не патрапіць выдушыць з Нямеччыны нічога, а толькі можа давесьці да новай рэвалюцыі. У насьледку гэтай уступчывасьці Францыі быў прыняты ў 1924 годзе на Лёнданскай конфэрэнцыі плян сплаты ваенных адшкадаваньняў, які падаў амэрыканскі фінансіст Давэс (чытай Доус). Вось-жа паводле пляну Давэса Нямеччына мела плаціць „толькі“ 42 мільярды марак у золаце. Але і гэты плян для Нямеччыны быў цяжкі і затым у 1929 годзе на канфэрэнцыі ў Гаазе быў прыняты плян амэрыканскага фінансіста Юнга, паводле якога Нямеччына мела плаціць роўна 36 мільярдаў 885 мільёнаў марак ваенных адшкадаваньняў у працягу 37 гадоў. Праз першыя гады Нямеччына мела сплачываць блізу па 2 мільярды марак, а пры канцы штораз меней. Найбольшую часьць гэтых адшкадаваньняў брала Францыя, пасьля Англія, Бэльгія, Італія і г. д.

А цяпер пытаньне: адкуль мела Нямеччына плаціць гэтулькі грошай?

Два былі жаралы, адкуль Немцы спадзяваліся дастаць патрэбныя грошы: актыўны гандлёвы білянс і пазычкі.

Каб мець актыўны гандлёвы білянс Нямеччына старалася чым-болей вывазіць заграніцу тавараў, за якія здабывала чужую валюту і як найменш увазіць да сябе у край. Каб абараніцца ад увозу да сябе рожных заграпічных тавараў, Нямеччына накладала на гэтыя тавары высокія мыта, або проста забараняла іх увозіць да сябе. Гэткая эканамічная палітыка Нямеччыны выклікала вялікае нездавальненьне ў другіх дзяржаў і таксама забарону ўвазіць нямецкія тавары. Згэтуль пачало пашырацца ў Нямеччыне безработьце (цяпер лік безработных дайшоў да 5 мільёнаў) і агульнае нездавальненьне да тых дзяржаў, якія хацелі выссаць апошнія сокі з пераможанай Нямеччыны. Значыць актыўнага гандлёвага білянсу, як жарала дзеля сплаты ваенных адшкадаваньняў, Нямеччыне на заўсёды здабыць не ўдалося. Дык асталося другое жарало, адкуль можна было чэрпаць грошы дзеля сплат адшкадаваньняў — гэта пазычкі. І сапраўды, Нямеччына пазычыла адусюль, адкуль толькі магла: пазычыць ад аднаго, аддасьць другому... Найболей запазычылася ў Амерыкі, у якой пазычыла некалькі мільярдаў даляраў. Але ў канцы і гэта жарало высахла — Нямеччыне ўжо ніхто не хацеў пазычаць! А тымчасам у гэтым годзе трэба было плаціць разам з працэнтамі болей як 2 мільярды марак ваенных адшкадаваньняў і даўгоў пакрыць дэфіцыт уласнага бюджэту блізка на 2 мільярды марак. Адкуль узяць гэтыя 4 мільярды марак? А ўзяць іх аднекуль трэба, бо інакш будзе банкруцтва ўсяе дзяржавы.

Нямеччына зьвярнулася ізноў да Амэрыкі, але Амэрыка адказала. Адно толькі прэзыдэнт Зл. Штатаў Паўночн. Амэрыкі Гувэр, бачачы цяжкое фінансавае палажэньне Нямеччыны, выступіў з прапазыцыяй агульнага мараторыя (адкладу) ў сплаце даўгоў і ваенных адшкадаваньняў на адзін год. Па-

водле гэтага мараторыя Нямеччына ў гэтым годзе ня будзе плаціць ніякіх адшкадаваньняў Францыі, Бэльгіі, Англіі і Італіі, а ізноў гэтыя дзяржавы ня будуць плаціць ваенных даўгоў Амэрыцы, якой яны доўжны разам з працэнтамі 22 мільярды даляраў! Проціў гэткага мараторыя выступіла Францыя, якая вымагла ад Нямеччыны далейшай сплаты ваен. адшкадаваньняў. Тады Нямеччына, за радай іншых дзяржаў, зьвярнулася з просьбай пазычкі да самой Францыі... якая пасьля вайны назьбірала ў свае банкі найбольш золата за ўсе эўрапейскія дзяржавы. Францыя спачатку была зьбянтэжана такім зваротам усяе справы, але скора апамяталася і паставіла справу так, што грошы абяцала даць, але зажадала ад Нямеччыны палітычных гваранцыяў. Ня даць грошай Францыя не магла, бо папершае ўсе ведаюць што яна іх мае, а падругое — прад усім сьветам Францыя не хацела паказацца віноўніцай нямецкай катастрофы. Дык трэба даць. А калі даць грошы свайму найбольшаму ворагу, то Францыя пастанавіла зажадаць ад Нямеччыны такіх варункаў: 1) адказ ад мытнай уніі з Аўстрыяй, 2) адказ ад будаваньня новых ваенных караблёў і 3) адказ ад перагляду Вэрсальскага трактату ў справе ўсходніх граніц і 4)адказ ад перагляду ваенных адшкадаваньняў. На гэтакія варункі Нямеччына не магла згадзіцца і ў рэзультаце ўсё асталося пастарому. Значыць: пазычкі для Нямеччыны няма, бюджэтны дэфіцыт расьце, безрабоцьце шырыцца — словам Нямеччына стаіць на краю катастрофы...

Адно толькі ўдалося Нямеччыне здабыць на нядаўнай Лёндынскай конфэрэнцыі —гэта адклад сплаты каротка-тэрміновых пазычак: амэрыканскія і іншыя банкі ўжо ня будуць так востра насядаць на Нямеччыну ў справе сплаты гэтых пазычак. Апроч гэтага Нямеччына мае абяцанку ўтварэньня банкаўскае камісіі, якая мае абсьледаваць нямецкія фінансы і абяцанку новай конфэрэнцыі, якая мае адбыцца за пару месяцаў у справе ваен. адшкадаваньняў. Ці Нямеччына дачакае „у шчасьці і добрым здароўі" да гэтай конфэрэнцыі — гадаць ня будзем, скажам толькі адно: Эўропа сяньня стала прад воблікам вялікай фінансавай катастрофы, выкліканай пасьляваеннымі даўгамі і адшкадаваньнямі. Ратунак быў-бы толькі адзін: каб дзяржавы—пераможніцы адказаліся ад сплаты Нямеччынай усіх ваенных адшкадаваньняў. Але на гэта ня хоча згадзіцца Францыя, якая цьвердзіць, што чым горш у Нямеччыне, тым для яе лепш (бо слабая Нямеччына для яе нястрашная) і што мусіць мець грошы дзеля сплаты даўгоў Амэрыцы. Другія дзяржавы — пераможніцы кажуць, што яны даравалі-б Нямеччыне, каб ім даравала Амэрыка іхныя даўгі, але Амэрыка аб гэтым і слухаць ня хоча, бо яна мае цяпер свае фінансавыя труднасьці — і калі-б яна згадзілася зьменшыць, або скасаваць даўгі, якія ў часе вайны зрабілі ў яе дзяржавы — пераможніцы, то трэба было-б залатаць гэтую дзіру ў яе бюджэце новымі падаткамі, якіх у Амэрыцы ніхто ня хоча. Затым палажэньне ў Эўропе і ўсім сьвеце робіцца штораз грозьнейшым — пры гэтым добрага выхаду з гэтага грознага палажэньня бадай што ня відаць.

Д—чык.

З беларускага жыцьця.

Радыкальны курс полёнофільства — „Голас Прады". Дня 25 ліпня с. г. вышаў у Вільні № 1 новай беларуска-полёнофільскай газэціны пад загалоўкам „Голас Праўды". Газэта гэта мае быццам выходзіць і далей. Рэдактар і выдавец гэтай часопісі ведамы б. грамадавец, а цяпер заядлы полёнофіл Ф. Акінчыц. Кірунак „Голасу Праўды" той самы, як і „Беларускага Звону" з невялікай рожніцай у тактыцы: „Голас Праўды" адважней ад „Бел. Звону" ганіць бальшавікоў і больш адкрыта заклікае Беларусаў ар'ентавацца на Польшчу.

Вышлі чарговыя нумары: — № 7 „Шляху Моладзі" — часопісі беларускай моладзі і № 12 „Chryścijanskaj Dumki".

Беларускія студэнты ў Празе Чэскай выдалі чарговы № 4 „Бюлетэню Аб'еднаньня Беларускіх Студэнскіх Арганізацыяў" (АБСА), які ў Польшчы сканфіскаваны.

БЕЛАРУСЫ Ў ЛАТВІІ.

Перад выбарамі. Даведываемся, што Беларусы ў Латві на выбары пойдуць ня ўсе разам. Беларуская Хрысьціянская Дэмакрацыя, як чуваць, лучыцца на выбары з латгальскімі хадэкамі, а група Пігулеўскага і Сахарава так-жа кожная паасобку,у лучнасьці з некаторымі латвійскімі партыямі. Даведваемся так-жа, што Беларуская Хр. Дэмакрацыя ў Латвіі мае выдаваць сваю газэту пад загалоўкам „Беларускае Слова".

З школьнага жыцьця. „Думка Беларуса" (№ 2 з дн. 1.VII с. г.) падае, што 4 чэрвеня с. г. адбыўся выпускны акт беларускай пачаткавай школы ў Дзьвінску, якую кончыла 14 вучняў. — 13 чэрвеня такі-ж акт адбыўся ў Рызе на Беларускіх Вучыцельскіх Курсах, якія кончыла 7 асоб. — 14 чэрвеня адбыўся IX выпускны акт Беларускай Дзяржаўнай Гімназіі ў Дзьвінску; матуру атрымала 8 асоб.

Чытайце і пашырайце

„Беларускую Крыніцу!"

З літоўскага жыцьця.

У Літве няма безработных. Літоўска газэта „Naujasys Tilses Keleives", якая выходзіць у Прусіі зьмясьціла адозву заклікаючы безработных у Прусіі літвіноў, каб выяжджалі ў Літву на работы, бо ў Літве ня то што няма безрабоціцы, але адчуваецца яшчэ за мала работнікаў у некаторых галінах прадукцыі.

Літоўскі кангрэс у Латвіі. Дня 16 м. м. у Рызе адбыўся літоўскі кангрэс. На кангрэс зьехаліся прадстаўнікі ўсіх літоўскіх арганізацыяў у Латвіі. На гэты кангрэс былі запрошаны і прадстаўнікі ад Беларусаў — грам. Сахараў і Барткевіч. Галоўнай справай на кангрэсе былі выбары ў Латвійскі Сойм, якія адбудуцца сёлетняй восеняй.

З украінскага жыцьця.

Звольнілі з вастрогу за каўцыю 10.000 зл. ген. сэкрэтара УНДО д-ра Л. Макарушку.

Зачынілі. Школьныя ўлады зачынілі Арх. Малую Сэмінарыю ў Рогатыне.

Памёр М. Ганкевіч, ведамы ўкраінскі соцыяліст і прыхільнік польскай ор'ентацыі.

З Польшчы.

Бюджэтны дэфіцыт і дзяржаўныя ашчаднасьці. Паводле афіцыяльнай справаздачы, дзяржаўны бюджэт Польшчы за першыя 3 месяцы 1931-га бюджэтнага году (красавік, травень і чэрвень) выказаў 76 мільёнаў 800 тысяч зл. недабору. Дзеля гэтага ўрад загадаў рэдукцыю ўрадоўцаў ад 1 жніўня, звальняючы з дзяржаўных пасадаў некалькі тысяч людзей. Далей, урад пляную рэарганізацыю адміністрацыйнага падзелу дзяржавы, касуючы некалькі ваяводзтваў, рэарганізацыю школьніцтва, зьмяншаючы ў пачаткавых школах курс навукі, падвышэньне даходовага падатку і пашырэньне падатку ад зямлі.—Як бачым, усе гэтыя „рэформы" палягаюць на павялічэньні ліку безработных, і на выцягіваньні з кішанёў новых грошаў на падаткі.

З прычыны безрабоцьця на фабрыках, у апошнія часы дайшло да шумных дэманстрацыяў у розных фабрычных цэнтрах.

Гэта ў галіне промыслу. А на сяле?...

Надовячы адзін з найстарэйшых польскіх пісьменьнікаў і дзеячоў, Ал. Сьвентохоўскі адмаляваў вось такі абразок сяла цэнтральнай Польшчы: „Хто хоча пабачыць сапраўдную бяду, той можа ўбачыць яе на вёсцы. Там пабачыць ён цёмныя, брудныя, сьмярдзячыя норы, у якіх жывуць людзі разам з зьвяратамі; там лахманы на целах вымараных холадам і магільная цішыня, якую

† Кс. Міхал Пятроўскі.

Радзеюць рады беларускіх змагароў, адзін за адным адыходзяць яны ад нас у краіну вечнасьці. Не парасла яшчэ травіцай сьвежая магіла трагічна памёршага аднаго з старэйшых беларускіх піонэраў Кс. Фр. Рамэйкі, як адышоў ад нас, залёг на вечны супачынак барацьбіт за долю Беларуса, гарачы патрыёт беларускі кс. М. Пятроўскі. Расстаўся ён з гэтым сьветам 25 ліпня сёл. г. маючы 42 гады, у Вінне, Бельскага пав., дзе апошнім часам быў пробашчам.

Міхал Пятроўскі радзіўся 1889 г. у Полаччыне, дзе па панскіх польскіх дварох ягоны бацька служыў эканомам. У гімназіі вучыўся ў Полацку, у Сэмінарыі ў Вільні, якую скончыўшы ў 1910 г. працаваў як вікары ў рожных беларускіх парафіях віленскай дыэцэзіі, як Жалудак, Лідзкага пав., Даўгінава, Вялейскага пав., Мосар, Дзісенскага пав. і інш.

Малады Міхась, ня гледзячы на тое, што з прычыны бацькавай службы ўсе свае маладыя гады пражываў сярод паноў, ніколі ня страціў пачуцьця сваей прыналежнасьці да беларускага сярмяжнага народу і заўсёды адзначаўся жывой да яго любоўю.

Яшчэ ў сэмінарскія часы М. П. ужо быў сьведамым Беларусам. Усьведаміла яго, як і многіх яго калегаў-клерыкаў, несьмяротная „Беларуская Дудка" Фр. Багушэвіча. Паглыбляла-ж ягоную беларускую сьведамасьць „Наша Ніва".

У 1913 г., калі кс. М. П. быў вікарым, у Вільні пачала выходзіць беларуская каталіцкая часопісь „Беларус", якой кс. М. П. быў сталым падпішчыкам, якую пашыраў сярод беларусаў каталікоў, у якой так-жа пакрысе і супрацоўнічаў.

У 1914 г. кс. М. П. пакідае працу пастырскую і едзе ў Пецярбург, дзе паступае ў Духоўную Акадэмію дзеля паглыбленьня сваей веды.

У Акадэміі кс. М. П., апрача працы навуковай, жыва цікавіўся справай беларускай, належыў да акадэміцкага гуртка студэнтаў беларусаў і быў дзейным сябрам яго.

У Акадэміі кс. М. Пятроўскаму не сядзелася. Ён рваўся да працы сярод народу. Вось-жа, прабыўшы ў Акадэміі тры гады і дастаўшы навуковую ступень кандыдата канонічнага права, кс. М. П. апынуўся сярод беларускага народу ў Шаркаўшчыне, Дзісенскага пав., куды быў назначаны пробашчам.

Падчас ведамай візытацыі ў Дзісеншчыне біскупа Роппа ў 1917 г., калі шырока была ў казаньнях па касьцёлах ужыванай беларуская мова, кс. М. Пятроўскі, як выдатны моўца, для гэтай мовы ў касьцеле палажыў вялікія заслугі. Прамаўляў тады пабеларуску ў касьцёлах кс. М. Пятроўскі, езьдзячы з біскупам: у Дзісьне, Друі, Іказьні, Гэрманавічах, Шаркаўшчыне, Даўгінаве.

На становішчы пробашча ў Шаркаўшчыне кс. М. Пятроўскі разьвіў шырокую рэлігійную і беларуска-народную працу. У касьцеле ён стала карыстаўся беларускай мовай На ягоныя казаньні, якія заўсяды адзначаліся сілай адчуцьця душы людзкой і сапраўды мастацкай формай, ахвотна ішлі ня толькі беларусы каталікі, але і беларусы праваслаўныя так-жа і з суседніх парафіяў.

Будучы пробашчам у Шаркаўшчыне працаваў так-жа нямала кс. М. П. і на ніве грамадзка-хрысьціянскай, закладаючы гурткі Хрысьціянскай Дэмократыі. 1918 г. 6 і 7 жніўня ў Гэрманавічах, Дзісенскага пав. адбыўся дэканальны зьезд каталіцкага духавенства, на якім між іншым было прызнана, што дзе няма народнай сьведамасьці, там няма і культуры, што абшар дзейнасьці Хрысьціянскай Дэмократыі ў дэканаце ёсьць беларускі і што школы ў дэканаце мусяць быць беларускія з мовай навучаньня беларускай, пры поўнай аўтономіі для іншых народнасьцяў. Арганізатарам гэтага зьезду, яго душой і аўтарам рэзалюцыяў з гэткім зьместам быў кс. М. Пятроўскі.

У 1919 г. кс. М. Пятроўскага спатыкаем пробашчам у Барунах, Ашмянскага пав. Варункі тут для беларускай працы былі значна цяжэйшыя, аднак ён і тут патрапіў зрабіць у гэтым кірунку нямала. Доказам гэтага служыць пісьмо да яго кс. Ч. Гурскага, тагочаснага Ашмянскага дзекана, у якім дзекан дараджае, каб кс. М. П. не гаварыў з народам пабеларуску, бо ўжо ўзбурыліся польскія ўлады і што за гэта можна дужа моцна пацярпець.

ўзварушваюць толькі крыкі праклёнаў. Большасьць сялян есьць двойчы, або і адзін толькі раз у дзень і то галоўна бульбу. У скамасаваных сёлах нават багацейшыя гаспадары ня маюць грошай, каб перанесьці на свае новыя гаспадаркі старыя будынкі і сядзяць у норах як лісы. Над гэтай абяднеўшай люднасьцяй круцяцца зьбірачы падаткаў (сэквэстратары), апісваючы за падаткі ўбогую іхную маемасьць"...

Збажжавы крэдыт для абшарнікаў. Польскія газэты шырока апавясьцілі, што французкія банкі далі для Польшчы 150 мільёнаў франкаў (каля 50 мільёнаў злотых) крэдыту на пазыкі сялянам пад залог збожжа. Пазыкі гэныя будзе раздаваць Зямельны (Рольны) Банк. Але гэтай пазыкі селяніну дастаць трудна, бо найменшая пазыка акрэсьляецца ў 2.000 зл., а каб дастаць яе, трэба мець пад залог збожжа на 4.000 зл.

З гэтага ясна, што такая пазыка даступна толькі для абшарнікаў, а селянін як ня меў дапамогі так і ня мае; тым балей селянін беларускі.

Сьмерць міністра. Дня 4 жніўня памёр ад хворасьці сэрца польскі міністр асьветы і веравызнаньняў др. Сл. Чэрвінскі.

З заграніцы.

Кангрэс Нацыянальных Меншасьцяў і Сэсія Лігі Народаў. У Жэнэве ад 29 да 31 г. м. адбудзецца чарговы VII Кангрэс Нацыянальных Меншасьцяў. Галоўнай справай на гэтым кангрэсе будзе выяўленьне палажэньня эўрапэйскіх нац. меншасьцяў, якое мае быць апавешчана друкам. Апрача гэтага будзе парушана справа неразьвязанага дасюль пытаньня г. зв. нацыянальных меншасьцяў, а так-жа і справа сусьветнага разаружэньня, якая мае адбыцца ў 1932 годзе. З прычыны актуальнасьці гэтых спраў сёлетні Кангрэс Нац. Меншасьцяў зварочвае на сябе агульную ўвагу.

Пасьля заканчэньня Кангрэсу Нац. Меншасьцяў адбудзецца так-жа ў Жэнэве ў пачатку верасьня с. г. чарговая сэсія Лігі Народаў (дзяржаваў), якая будзе радзіць над цяжкім сучасным палажэньнем Эўропы.

Англія згаджаецца на ўтварэньне сталай камісіі пры Лізе Народаў дзеля вырашаньня спраў нац. меншасьцяў. Міністр Гэндэрсон заявіў, што ангельскі ўрад прыхільна адносіцца да сарганізаваньня сталай камісіі дзеля разгляду спраў нацыянальных меншасьцяў, але не прыабяцаў выступіць у гэтай справе на найбліжэйшай сэсіі Лігі Народаў з адпаведнай прапазыцыяй.

Нездаваленьне Палякаў у Латвіі. Палякі на ўсходзе Эўропы прызыклі ўважаць каталіцкі касьцёл за сваю нацыян. пляцоўку. Гэта мы бачым на Беларусі, Украіне і ў іншых мясцох усходняе Эўропы. У апошнія часы з гэтае прычыны ў Латвіі, у Іллукштанскім пав. дайшло да непаразуменьня польскіх нацыяналістаў з Латвійскай р.-каталіцкай духоўнай і нават судовай уладай.

Палякі, карыстаючыся шырокай латвійскай толеранцыяй пашыралі сваю „дзейнасьць" у Іллукшчыне, дзе Палякаў ёсьць сусім невялікі процант, на ўсіх тамашніх каталікоў. Супроць вынарадаўленьня Палякамі Іллукшчыны выступілі мясцовыя духоўныя ўлады і ўрадавыя чыннікі Латвіі і здаецца полёнізацыйную акцыю ў Іллукшчыне прыпыняць. Трэба ведаць, што ў Іллукшчыне ня мала ёсьць і Беларусаў, якіх Палякі дагэтуль абраблялі на карысьць польшчыны.

Камуністы ў С.С.Р.Р. варочаюцца назад. Да гэтага часу ў С.С.Р.Р. кожны не камуніст быў чалавекам без правоў, над якім быў пастаўлены камуністычны кантроль. А камуніст — гэта быў уладар і пан палажэньня. Цяпер-жа цэнтральныя камуністычныя ўлады „зьлітаваліся" над безпартыйнымі і прызналі іх у роўных правох з партыйнымі. Да гэтага кроку змусіла бальшавікоў іх нявуцтва, бо ўсе не пакамуністычнаму вучоныя людзі ў партыю камуны не запісваліся, а вялізарнай дзяржаўнай гаспадаркай „вучоныя" пакамуністычнаму пакіраваць ня могуць.

Д-р Фр. Кордач — р.-каталіцкі архібіскуп Прагі (Чэхаславаччына) зрокся сваей архібіскупскай годнасьці. Неспадзяваная гэта вестка зрабіла ў касьцельных і палітычных кругох вялікае ўражаньне.

Да нас пішуць:

АРЫШТЫ Ў МАЛАДЭЧАНСКІМ ПАВЕЦЕ.

Палачаны. У нашай гміне дня 28 мін. месяца адбыліся арышты. Паліцыя ў больш сьведамых Беларусаў правяла вобыскі, пазабірала легальныя друкі — статут Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры і арыштавала: М. Сеньку, Г Сьвінчука, А. Казлоўскага, М. Пятровіча, Я. Садоўскага, М. Рудзіка і інш.

Пасьля арыштаў мы даведаліся, што такія-ж арышты адбыліся ў Лебядзеўскай гміне і ўва ўсім Маладэчанскім павеце, даведаліся там-жа і аб прычыне арыштаў. А яна вось якая: некалькі хуліганаў проста правакацыйна раськідалі па сёлах камуністычныя праклямацыі, у якіх камуністычныя жыдкі К.П.З.Б. лаюць Беларусаў і заклікаюць народ, каб разам з імі і па іхняму сьвяткавалі нейкае камуністычнае сьвята, дзень 1 жніўня.

Паліцыя, замест лавіць толькі тых хуліганаў, якія займаюцца такой пусьцячынай, зграбілі як сена ўсіх больш дзейных Беларусаў і сагналі ў павет на сьледзтва. Пры гэтым кожны паліцэйскі па своему разумеючы праступнасьць, нават і легальны друк беларускі залічвае камуністычным і з гэткім „доказам праступнасьці" пёр людзей за некалькі дзесяткаў вёрст у павет, каб там павятовае начальства гэтую справу разгледзіла. Рэч ясная, што такія „праступнікі" з такімі доказамі іх „праступку," як легальны беларускі друк і тое, што яны дзейныя Беларусы, зараз-жа павятовымі ўладамі былі звольнены. З нашай гміны, вышэй пададзеныя асобы звольнены так-жа ўсе да аднаго.

Гэткім арыштам найбольш пакрыўджаны Беларусы, а камуністы свайго дапялі, бо стэрорызавалі Беларусаў.

Браты, старайцеся даць адпор нацыянальнаму і соцыяльнаму ворагу. Арганізуймася ў свае беларускія арганізацыі, выганяйма вон камуністычных падшыванцаў і адкрыта, легальна і стойка баранiма свае народныя і соцыяльныя беларускія правы. Калі-б за сваю справу прышлося і цярпець, дык чалавек ведаў-бы, што церпіць за свае, а то цяпер за нашае цярпеньне і сьлёзы нашых сем'яў камуністычныя жыдкі прысвойваюць назоў „абаронцаў" пакрыўджаных.

Проціў варожай сілы, якая так ганебна нас мучыць, нам трэба проціўставіцца сваей народнай беларускай арганізацыяй.

Пакрыўджаныя.

ТРЭБА СЬВЯТЛА.

Баяры, Нясьвіскага пав. У суседняй вёсцы Ліпе, на Сёмуху с. г. моладзь, каб павесяліцца, зладзіла ігрышча. Ігрышча гэнае было не арганізаванае, а проста так: зышлася моладзь і давай, як хто ўздумаў, вырабляцца. У канцы неарганізаваныя гульні дайшло і да бойкі. У выніку ўсяго гэтага палілася кроў і асталіся пячаткі — раны на галовах учасьнікаў такога ігрышча.

Браты, сорамна нам, што мы і пагуляць як сьлед ня ўмеем. А вінавата гэтаму наша цемната. Дык прасьвячаймася, каб ня быць падобнымі да зьвярат. Выпісвайма і чытайма свае родныя беларускія газэты. Газэта навучыць нас шанаваць другіх і самых сябе. З газэты даведаемся, як трэба змагацца з горам, бядой і цемрай. Чытаючы сваю беларускую газэту мы знойдзем шлях да лепшых дзён нашага жыцьця. Дык чытайма свае родныя беларускія газэты: „Беларускую Крыніцу", „Шлях Моладзі" і інш.

Баярэц.

З краю.

АРЫШТЫ. Дня 28 мінулага месяца паліцэйскія ўлады даканалі рэвізіі і арыштаў у паветах: Маладэчанскім, Вялейскім і Ашмянскім. Рэвізіі і арышты адбыліся з прычыны заварушэньня камуністычных наймітаў, якія раськідалі праклямацыі, заклікаючыя да „сьвяткаваньня" камуністычнага „Міжнароднага чырвонага дня," які прыпадаў на дзень 1 жніўня.

У зьвязку з гэтым арыштавана многа людзей і 16 асоб перададзены судова-сьледчым уладам.

Так, за беларускую справу кс. М. Пятроўскаму хутка сапраўды прышлося пацярпець і то нямала.

У 1920 г., калі прышлі ў наш край бальшавікі, яны кс. М. П. ў Барунах арыштавалі, загналі ў Ліду і праз некатары час трымалі там у вастрозе.

У тым-жа годзе з Лідзкага вастрогу кс. М. П. узноў вярнуўся ў Баруны. Бальшавікоў прагналі палякі. Для кс. М. П. пачаліся новыя цярпеньні.

Кс. М. Пятроўскі ўсюды, дзе толькі быў, карыстаўся вялікім уплывам сярод народу. Чуткі на людзкія патрэбы, заўсёды гатоў да помачы, несрэбралюб, незмардаваны працаўнік на ніве рэлігійна-маральнай і прасьветнай, адважны заступнік за пакрыўджаных прад сільнымі гэтага сьвету, здольны ўрэшце прамоўца — кс. М. Пятроўскі ўсюды і заўсёды быў улюбенцам народу, які за ім хоць у вагонь ішоў-бы.

Знаді гэта розныя „апякуны" народу і не драмалі. Прад польскай уладай стаяла тады вялікае для яе заданьне — справа далучэньня нашага краю да Польшчы. Ведала яна добра, колькі ей у гэтым можа папсуць кс. М. Пятроўскі, дык пачала проціў яго атаку. Польская партыя „Одродзэне" на сваім зьезьдзе 16.II.1921 г. скаржыцца, што кс. М. П. і яму падобныя дужа перашкаджаюць ей у справе полёнізацыі і ў справе затрыманьня нашага краю пры Польшчы. Гэткага-ж зьместу паяўляюцца скаргі ад уладаў вайсковых, якія нават падазраюць кс. М. П. ў блізасьці з бальшавікамі. Генэрал Макрэцкі, старшыня часовай урадавай камісіі так званай Сярэдняй Літвы, дамагаецца ад біскупа Матулевіча спыніць беларускую дзейнасьць кс. М. Пятроўскага. Ды не на такога трапіў. Ніякай бруднай справай ня апляміў сябе гэны сапраўды справядлівы і добры чалавек!

Асталася толькі фізычная сіла. Яна і была ўжыта, 28.VI.1921 г. Кс. М. Пятроўскі быў у Барунах арыштаваны і пасаджаны ў Лукіскі вастрог у Вільні. Вінавацілі яго па 129 арт. К. К. У турме не дазволілі адпраўляць сьв. Імшы нават у нядзельныя і сьвяточныя дні. Урэшце, ня могучы даказаць ніякага праступку і зважаючы на слабасьць сэрца ў вязьня, 13.VII таго-ж году кс. М. Пятроўскага пад стражай адправілі да пробашча сьв. Якуба, адтуль-жа 15.VII так-жа пад стражай перавялі да рэктара касьцёла сьв. Сьцяпана ў Вільні. У адным пакоі разам быў памешчаны ўзброены паліцыянт. Урэшце, дзякуючы пратэсту біскупа Матулевіча, 17.VII паліцыянт быў з пакою выведзены і пастаўлены пры браме. 22.X страж была сусім зьнята і кс. М. П. апынуўся на свабодзе, але бяз права вярнуцца ў сваю парафію ў Баруны.

Пасьля гэтага некаторы час кс. М. П. прабывае бяз мейсца, а ўрэшце быў назначаны пробашчам у Даўгінаве, Вялейскага пав. Спачатку і тут пачынае наш сакол распускаць свае крыльлі да лёту, ды ня было ўжо сіл. Кс. М. П. заўсёды цярпеў на сэрца. Турма-ж бальшавіцкая і польская хворае ягонае сэрца дабілі да рэшты. У Даўгінаве кс. М. Пятроўскі — гэта ўжо слабое разьбітае начыньне. Прымоўк, прыціх, прыхмурнеў, усьцяж з рукой на балючым сэрцы, яшчэ ўчора поўны кіпучай сілы і радасьці жыцьцёвай, — сяньня відавочна адцьвітаў, жоўк-прыбліжаўся да... сьмерці.

Але хацелася жыць. Кс. М. П. шукае спакойнага куточка для разьбітага свайго сэрца. На ўласную просьбу быў перанесены з Даўгінава ў парафію Вішна, Бельскага пав., ляжачую на беларускіх рубяжох. Ад беларускай справы адыходзе, паволі для яе ўмірае, хоць час ад часу адзываецца і выказвае яшчэ сваю блізасьць, сваю ціхую любоў да яе, да такога-ж гаротніка, як і ён сам, беларускага народу. А жыцьцё ўсьцяж ад яго ўцякала. Некалькі апошніх гадоў — гэта было павольнае заміраньне. Яшчэ месяц таму кс. М. П. пісаў да знаёмых: „ах, сэрца, сэрца, што яно са мной выробляе!... Чую, як туляецца за плячыма сьмерць мая... І цяжка і страшна, але каб скарэй! Няхай дзеецца Воля Божая!..."

А вось гэна воля Божая і споўнілася. 25 ліпня с. г. нашага слаўнага кс. М. Пятроўскага між намі ня стала. Дай, Божа, супакой Ягонай душы!...

Ab haspadarcy.

Vyrab marmelady.

Na vyrab marmelady ŭžyvajucca jabłyki jhruški, čarešni i inš. sadovina, navat apadki, a taksama lasnyja jahady. Sposab jejnaha pryhatavańnia bolš-mienš hetaki:

Jabłyki (dla prykładu) treba pierabrać, pieramyć i vyrazać nadapsutyja čaści. Hetak pryhatavanaja sadovina ŭsypajecca ŭ pasudzinu, kudy nalivajecca na dno krycha vady, kab spod pry vareńni nia prypalivaŭsia i pačynajecca samaje vareńnie, pry stałym miašańni, až pakul nie razvarycca ŭsio na kašu. Jak heta staniecca, jabłyčnaja kaša pieracedžyvajecca skroź łykavaje (nie dracianaje!) rešata, na jakim astajecca ŭsio niepatrebnaje, miž inšym ziarniaty, kostački i inš., a pracedžanaja miazha varycca kala hadziny času pry stałym miašańni. Paśla dajeccca na kožnaje kilo spatrabavanych jabłykaŭ — funt (20 dkg) piaskovaha cukru i varycca jšče 30—40 minut, ŭściaž miašajučy.

Vareńnie marmelady končana tady, kali jana z łapatki, jakoj miašajecca, nie ściakaje roŭna, ale spadaje asobnymi kavałkami, a barazna zroblenaja pa viersie łapatkaj — v o l n a zaciahujecca. Heta znak, što dalej ŭžo varyć nia tolki nia treba, ale i nielha.

Hatovuju marmeladu źbirajuć z a h a r a č a ŭ šyrokija słai, l o h k a prykryvajuć i pakidajuć volna styhnuć da druhoha dnia. Astyhšyja słai z marmeladaj zaviazujucca na druhi dzień perhaminovaj papieraj i staŭlajucca ŭ chałodnaje miejsca.

Pry vyrablańni marmelady z ihrušak, radziać na kožnyja dźvie čaści jhrušak davać adnu čaść jabłykaŭ: marmelada chutčej i lepš zahuśnie.

Vyrab jabłyčnaha vina.

Na vyrab jabłyčnaha vina vybirajucca sarty kisłych (vinnych) jabłykaŭ. Najlepš adnak užyvać da hetaha miešaniny: na kožnyja dźvie čaści kisłych jabłykaŭ — adnu čaść sałodkich. Poznyja jabłyki dajuć vina bolš tryvałkaje ad vina z jabłykaŭ rannych. Samy vyrab jabłyčnaha vina składajecca z 1. pryhatavańnia mošču, 2. kvašeńnia mošču i 3. daśpiavańnia.

Jabłyčny m o š č heta zvyčajny sok vyciśnieny z jabłykaŭ. Dziela hetaha jabłyki pierabirajucca i myjucca. Usiakija červatočyny i nadhniŭšyja miajscy z jabłyka vyrezyvajucca, ale abirać samo jabłyka, a taksama vybirać z jaho ziarniaty zahadzia nia treba: heta zrobicca paśla. Z pryhatavanych hetak jabłykaŭ vyciskajecca sok pry pomačy adumysłovaha lisu (presu), abo hetyja jabłyki taŭkucca ŭ čystaj sudzinie, Sciarahčysia pry hetym treba, kab ani jabłyki, ani tymbolš jabłyčny mošč nia stykaŭsia nihdzie z žalezam, ci čyhunom; u praciŭnym razie vino budzie mieć žalazisty smak i kolar jahony budzie čorny.

Tak ci jnakš pryhatavanuju jabłyčnuju kašu nia treba zrazu vyžymać (lisavać): pry temperatury 17°C (zvyčajnaja chatniaja temperatura) vyžymańnie možna pačać tolki za 12 hadzin, a pry temperatury mienšaj za 17°C za— 24—48 hadzin (1—2 dni). Paśla hetaha jabłyčnaja kaša lisujecca (vyžymajecca), a dzie niama lisu, tam heta kaša nakładajecca ŭ čysty parciany miašok i na čystaj hablavanaj došcy kładziecca pad druhuju takuju-ž došku, naciśnienuju kamieńniami, jak heta robicca ŭ nas pry vyrabie syru. Hetym samym addzialajucca z jabłyčnaj kašy i ziarniaty. Uspomnienyja doški, jak i ŭsia pasuda na jabłyčny mošč i vina musiać być abaviazkova tolki z listnaha dreva (dub, buk).

Hetak atrymany sok (mošč) treba k v a s i ć Prad tym adnak na kožny litr mošču z k i s ł y c h jabłykaŭ dadajecca paŭlitra pieravaranaj vady i 20 dkg (paŭfunta) cukru, a pry mošču z siarednie-s a ł o d k i c h jabłykaŭ — čvierć litra pieravaranaj vady i 15 dkg cukru (na 7 litraŭ mošču — 1 kg cukru).

Kvasicca vino najlepš u vialikich (10-ci litrovych i bolšych) šklanych butlach, abo ŭ hubovych ci bukovych bačonkach. Bačonki treba prad tym dobra vyparyć, vyšaravać i vykuryć sierkaj. Kusok parcianki namačyvajecca ŭ sierku, nadziajecca na drot i apuščany ŭ siaredzinu bačonki — spalivajecca; ale datykacca samoj bočki nia śmieja! Paśla hetaha bačonak zatykajecca korkam na 1 hadzinu i jon užo pryhatavany da ŭžytku. — Kvašeńnie vina byvaje abo samarodnaje, abo ŭ mošč dadajucca sumyśla vinnyja droždžy: jany raspuskajucca ŭ 1—2 pieravaranaha mošču, staviacca ŭ ciopłaje miejsca i jak zašumujuć — ulivajucca ŭ reštu mošču, prad tym užo ŭlitaha ŭ butlu ci bačonak. Zapraŭleny hetak mošč zatykajecaa h. zv. „kvašelnym korkam," jaki nie dapuskaje ničoha ŭ siaredzinu butli, ale praz jaki moža vychadzić z siaredziny vuhlakisły haz (CO_2), što vytvarajecca pry kvašeńni mošču. Treba pry hetym uvažać, kab butla była ŭściaž p o ŭ n a j a i dalivać jaje sałodžanaj pieravaranaj vadoj. U praciŭnym razie paŭstaje actovaje kvašeńnie, jakoje psuje vino biespavarotna. Kvašeńnie vina adbyvajecca roŭnamierna pry stałaj i niamianiajučajsia temperatury, najlepš pry 10-14° C. Za 3-4 dni droždžy tak razmnožacca i hetulki vydzialajuć hazu, što ŭ siaredzinie butli paŭstaje šum: heta „burlivaje kvašeńnie," jakoje tryvaje 2—3 i bolš tydni.

Paśla hetaha droždžy apadajuć na dno i vino prajaśniajecca, sčyščajecca. Za 2—3 tydni paśla „burlivaha kvašeńnia" s č y ś c i ŭ š a j e s i a vino ściahujecca ŭ inšuju sudzinu pry pomačy kaŭčukovaj rurki, adzin kaniec jakoj apuskajecca ŭ sudzinu z zakvašanym moščam tak hłyboka, kab siahaŭ najhłybšaha prazrystaha słoju vina, tu-ž nad źlohšaj mułoj(draždžami),a druhi— vychodzić z horła butli i źvisaje značna nižej, čymsia samaja butla. Hety apošni kaniec rurki biarecca ŭ zuby i vysysajecca z jaje pavietra. Razam z hetym palijecca praz jaje i vino, jakoje budzie ściakać u pastaŭlenuju sudzinu (butlu ci bačonak). Zamiest u butlu ci bačonak možna ściahivać vino hetak prosta ŭ paasobnyja butelki, jakija paśla nahłucha zakarkovyvajucca, zalivajucca voskam, ci lakam i składajucca ŭ sklepie l a ž m a ŭ piasok. Robicca hetak pry vyrabie vina dla chatniaha ŭžytku.—Lepš adnak daviaści pracu da kanca i prad raźlivańniem u butelki, d a k v a š y v a ć vino ŭ vialikich bačonkach, ci butlaeh, z zachavańniem usich vymohaŭ: temperatura nia vyšejšaja 10°C, p o ŭ n a j a sudzina i „kvašelny korak."

Vino paśpiavaje całkom da ŭžytku nie raniej adnaho hodu: za hety tolki čas jano paśpiavaje całkom vytvaryć adpaviedny smak, aromat i stacca iskrysta-prazrystym. Ab takim vinie kažuć, što „maje dobruju iskru."

Sušeńnie jhrušak i ślivak.

Da sušeńnia najlepšyja sarty jhrušak, što majuć šmat cukru i miakkaje miasa. Jhruški musiać być śpiełyja, ale niepieraśpielenyja. Prad sušeńniem ich treba cieńka ababrać, a bolšyja— raskroić papałam; ziarniat vybirać nia treba.

Pravilnaje sušeńnie jhrušak składajecca z parańnia i ŭłaścivaha sušeńnia. Paracca jhruški tak doŭha, až pakul źmiaknuć i dajucca prapichnuć sałominaj, ale nie razvalivajucca. Paśla hetaha raskładajucca paadnej i pačynajuć sušycca zrazu pry vysokaj temperatury (až da 80°C). Z časam temperatura abnižajecca (pry sušeńni ślivak — naadvarot). Sušačyjasia jhruški treba što 10—15 minut pierastaŭlać, abo pieravaračyvać. Jhruški s a ł o d k i j a da ćviarda sušyć nia treba. — Chto nia maje-ža takich bolšaść — adumysłovaha parnika, chaj paryć jhruški ŭ zvyčajnym šyrokim haršku, jaki adnak musić 1. dobra zakryvacca i 2. mieć dziurkavanaje dno, pad katorym — pamiž ułaścivym dnom i jhruškami —znachodzicca kipiačaja vada. Hetki parnik moža kožny sam sabie zrabić.

Sposab sušeńnia ślivak u zasadzie zhadžajecca z šušeńniem jhrušak. Tolki śliŭki da sušeńnia musiać być jaknajstarańniej vyśpielanyja i celyja. Samaje sušeńnie ślivak nia śmieje być nahłym, a tolki pavolnym. U Francyi praces sušeńnia niekalki razoŭ praryvajuć, a sušeńnie samo pačynajuć z vielmi nizkaj temperatury (35°C).

inž. A. K.

БЕЛАРУСКАЯ КНІГАРНЯ „ПАГОНЯ"
мае на складзе і прадае ўсе найнавейшыя беларускія выданьні і школьныя падручнікі для ўсіх школаў. Багаты выбар усякіх пісьменных прыладаў па найніжэйшых цэнах.
Сумленнае выкананьне заказаў з вёскі.
Кожны Беларус купляе і выпісвае патрэбныя сабе кнігі праз кнігарню „PAHONIA" Wilnia, Ludwisarskaja 1.

ЖНІВО.

Ціхі ветрык вее ў полі,
А з ім шэпчуць каласы...
Хмаркі ў даль плывуць паволі
Праз узгоркі і лясы.

Сена сьвежага пакосы
Ўжо ляглі праз цэлы луг,
Ўжо зьвіняць далёка косы,
Чутны песьні маладух.

А жаўронак ўсьцяж сьпявае
Чуць-чуць займецца зара;
Ўжо вясёлая настала
І шчасьлівая пара.

Стала рада кожна хата —
Ўсе ўзяліся за сярпы,
А плаціць за ўсё багата
Будуць жоўтыя снапы.

Коко.

Усячына.

ЖНІВО І УРАДЖАЙ. У канцы мінулага і ў пачатку бягучага м-ца ў нашым краю пачалося жніво. Ураджай на жыта ў сёлетнім годзе незадаваляючы; у шмат мясцох жыта амаль сусім прапала, а ў іншых— адбіў град. У вялікай меры пашкодзіў град і на ўраджай ярыны, а ў некаторых мясцох прапалі яравыя пасевы ад сухамені (засухі).

Сёлетні ўраджай многа меншы ад леташняга і ў іншых краёх сьвету, а прадусім у Канадзе, якая найбольш прадае збожжа на сусьветныя рынкі.

КАПІТАЛІСТЫЧНЫЯ І КАМУНІСТЫЧНЫЯ ШТУКІ. Камунізм недалёка адышоў ад капіталізму. Спосабы дзеля выціскаяьня грошай з працоўнага народу ў іх аднолькавыя. Як капіталісты, так і камуністычная ўлада ня лічацца ані з бядой і голадам людзей у здабываньні капіталаў. У апошнія часы і капіталісты і камуністы дзеля заработку грошай завялі свойскі ім спосаб гандлю, які называецца „дэмпінг." Гэты „дэмпінг" палягае на тым, што ў сваіх дзяржавах свой тавар капіталісты цэняць дорага, а заграніцу прадаюць танна. Гэтак сама паступаюць і камуністы, каб рабіць конкурэнцыю, каб руйнаваць промысл і гандаль другіх, а на іх мейсцы пашыраць свае вырабы. Ад гэткай „вайны" за грошы ў першую чаргу церпяць работнікі і сяляне, бо камуністы свой тавар прадаюць у сваім краю па дарагой цане — дык „сваё" ўсёроўна выручаць, а на заграгранічны тавар дзяржава накладае падатак — (цло). У выніку — дарагі тавар і свой і заграгнічны. Пачынаецца застой тавараў і зьмяншаецца патрэбнасьць яго прадукцыі, бо гэты тавар становіцца шырэйшым працоўным масам не даступны. У выніку безрабоцьце і голад сярод работніцтва. Прыкладам, бальшавікі вельмі танна прадаюць у Манджурыю палатно, паркалі цукар і інш. тавары, каб рабіць там конкурэнцыю японскім і ангельскім таварам, а ў Сібіры гэтых тавараў бальшавікі не прадаюць, бо яны выробляюцца толькі на вываз заграніцу. Кітайцы, купляючы гэтыя тавары ад бальшавікоў, робяць добрую спэкуляцыю, бо з добрым заработкам, ціхачом, кантрабандай, перапрадаюць гэтысамы тавар спэкулянтам у Сібір, а тыя з-пад палы, за вялікія грошы прадаюць ужо свайму насельніцтву.

Такія самыя штучкі робіць і польскі цукровы промысл і іншыя прамысловыя трэсты(умоўныя супалкі). Словам, капіталісты з камуністамі самі з сабою рознымі гандлёвымі штучкамі — „дэмпінгамі" ваююць аб больш заработак, а працоўныя масы за гэта дорага плацяць і церпяць безрабоціцу ды голад.

Наша пошта.

Сьцепанелю Ал. Ад Вас грошы за газэту атрымалі ў месяцы красавіку і ад таго часу акуратна на пошту Сіняўка пасылаем Вам газэту. Чаму Вы не атрымліваеце ня ведаем, відаць не даручае пошта. Трэбуйце на пошце і падайце на паштара скаргу ў Дырэкцыю Пошт і Тэлеграфаў у Вільні.

Суднікy Яну. Каморніка, які ў Вас падступам вымантарыў 145 злотых, перадайце ў суд, калі маеце сьведкаў, або сьпярша напішыце да яго, каб зьвярнуў Вам грошы, а калі адмовіцца, дык астаецца толькі ў суд падаць.

Шульжыцкаму. Адчуваем Вашае гора, але аб гэтым у газэце пісаць няма як, бо гэта Ваша прыватная і асабістая справа, якая ня мае ніякага агульнага значэньня.

Сёмаку. Газэту Вам пасылаем, інфармуйце і другіх.

Дварэцкаму. Газэту Вам у Граево пасылаем. Ці будзеце магчы прыехаць увосень на зьезд?

Журня. Карэспандэнцыю надрукуем, дзякуем, пішыце больш. Кніжкі, аб якіх пытаеце, ў кнігарні „Пагоня" ёсьць, да набажэнства нешта больш як па 2 злоты, а „Смык" некалькі грошаў. Выпісвайце, прышлюць.

Велькоўшчыку. Дзякуем, пры нагодзе скарыстаем.

Канганіну ў Аргентыне. Газэту пасылаць будзем і чакаем падпісной платы за яе.

Ярмалковічу. Просьбу споўнім, аб Кейпунах нічога ня ведаем і ніхто здаецца туды ня зьбіраецца. Мар'ян выехаў.

Сьвіслачаніну. Дзякуем, скарыстаем, пішыце больш.

Якімовічу. Газэты Вам ня спынялі і яна пэўне ляжыць на пошце, трэбуйце, мусяць аддаць. У справе суду падайце прашэньне ў той самы суд з просьбай паведаміць Вас аб бегу Вашай справы і вызначэньні яе на разгляд.

Нехта М. Пісьмо атрымалі, дзякуем у наступным нумары скарыстаем.

Макарэвічу. Атрымалі, дзякуем, скарыстаем.

Грошы атрымалі ад: Паплаўскага 1 злот газэту пасылаем, трэбуйце на пошце. Турлая 1 зл., а. Туронка 5 зл. Г. Якубёнка 1 зл. і Гэбэтнэра і Вольфа 3 зл. Дзякуем газэту пасылаем.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч